## ЗАГАДКА Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

***А. Р. Бічан** (УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
*Навук. кір. **В. Я. Барысенка**,*
*канд. філал. навук, дацэнт*

Актуальнай задачай маўленчага развіцця ў малодшым школьным узросце з'яўляецца выпрацоўка дыкцыі. Вядома, што ў дзяцей гэтага ўзросту не зусім выразна працуюць органы моўнага апарату. Некаторым дзецям уласціва паспешлівасць або невыразнае вымаўленне слоў ці «праглынанне» канчаткаў. Назіраецца і залішне запаволеная, расцягнутая манера вымаўлення слоў. Пэўныя практыкаванні дапамагаюць пераадольваць дзецям такія цяжкасці, удасканальваюць іх дыкцыю.

Лепшы матэрыял для дыкцыйных практыкаванняў – прыказкі, прымаўкі, народныя песні, загадкі. Малыя формы фальклору лаканічныя па форме, глыбокія і рытмічныя. З іх дапамогай дзеці вучацца выразнаму вымаўленню, праходзяць школу мастацкай фанетыкі. Прымаўкі і прыказкі – моўная крыніца, якая сабірае стагоддзямі моўны вопыт шматлікіх пакаленняў. Выкарыстоўваючы прыказкі і прымаўкі, дзеці вучацца дакладна, вобразна, выразна выказваць свае думкі і пачуцці, інтанацыйна афарбоўваючы сваю прамову, у іх развіваецца ўменне правільна выкарыстаць слова пры апісанні прадметаў.

Загадка – адна з малых формаў вуснай народнай творчасці, у якой падаюцца найбольш яркія, характэрныя прыметы прадметаў або з'яў. Разгадванне загадак развівае ў малодшых школьнікаў здольнасць аналізаваць, абагульняць і рабіць самастойныя высновы, а таксама вылучаць найбольш характэрныя, выразныя прыметы прадметаў або з'яў. Загадкі ўзбагачаюць слоўнік дзяцей, дапамагаюць убачыць іншыя значэнні слоў, фарміруюць уяўленне аб пераносным значэнні слова. Дапамагаюць засвоіць гукавы і граматычны лад беларускай мовы. Выкарыстанне загадак спрыяе развіццю ў дзяцей навыкаў даказваць і апісваць з'явы, прадметы і інш. Уменне даказваць – гэта не толькі ўменне правільна, лагічна думаць, але і правільна выказваць сваю думку.

Каб дзеці хутчэй авалодвалі апісальнай формай у маўленні, неабходна звяртаць іх увагу на моўныя асаблівасці загадкі, вучыць заўважаць прыгажосць і своеасаблівасць мастацкай выявы, разумець, якімі маўленчымі сродкамі яна створана. Трэба вучыць дзяцей бачыць кампазіцыйныя асаблівасці загадкі, адчуваць яе рытм і сінтаксічную канструкцыю.

Такім чынам, з дапамогай малых формаў фальклору дзеці выяўляюць тую або іншую інтанацыю, у іх развіваецца чуласць да мовы, яны вучацца карыстацца рознымі сродкамі, адбіраць неабходныя словы, паступова авалодваючы вобразнай сістэмай мовы.

## А. СОЛЖЕНИЦЫН О СТРАДАНИИ В СУДЬБЕ РУССКИХ ПИСАТЕЛЕЙ (НА ПРИМЕРЕ «ЛИТЕРАТУРНОЙ КОЛЛЕКЦИИ»)

***К. Н. Борисова** (УО «ГГУ им. Ф. Скорины»)*
*Научн. рук. **И. Н. Афанасьев***
*канд. филол. наук, доцент*

«Литературная коллекция» А. Солженицына представляет собой запись «обновившихся впечатлений», появившихся у писателя после повторного прочтения произведений русской литературы XIX и XX вв. Александр Исаевич так писал о своей «коллекции»: *«Каждый такой очерк — это моя попытка войти в душевное соприкосновение с избранным автором, попытаться проникнуть в его замысел, как если б тот предстоял мне самому, — и в мысленной беседе с ним угадать, что он мог ощущать в работе, и оценить, насколько он свою задачу выполнил».*